**Философия**

*УДК 116:101.1*

# Філасофскія і тэарэтыка-метадалагічныя падставы супрацьстаяння сепаратыўным працэсам

Я.С. Ермакоў

У артыкуле вывучаецца мікраўзровень самаарганізацыі соцыума. Прапаноўваюцца сацыяльныя карціны свету як адмысловыя кагнітыўна-эпістэмалагічныя схемы, якія праз свядомасць, мову і асяроддзе, з аднаго боку, і дзеянні суб'екта – з іншага, уплываюць на сацыяльную рэальнасць і ўспрыманне яе чалавекам. На гэтай падставе даследуецца роля сацыяльных карцін свету ў дынаміцы сепаратыўных працэсаў і фармулююцца філасофскія і тэарэтыка-метадалагічныя падставы супрацьястаяння сепаратызму і сепаратыўным выклікам.
**Ключавыя словы:** псіхафізічная праблема, свядомасць, сацыяльныя карціны свету, назіральнік-удзельнік, моўная гульня, сепаратыўныя працэсы, гарманізацыя.

The article studies the micro-level of self-organization of society. The social world patterns are proposed as special cognitive and epistemological schemes that, through consciousness, language and the environment, on the one hand, and the actions of the subject, on the other, affect social reality and human perception of it. The role of the social world patterns in the dynamics of separative processes is investigated and philosophical, theoretical and methodological foundations of opposition to separatism and separative challenges are formed on this basis.
**Keywords:** mind-body problem, consciousness, social world pattern, observer-participant, language-game, separative processes, harmonization.

**Уводзіны.** Сепаратыўныя працэсы як працэсы дэзінтэгратыўнага характару, якія закранаюць як асобныя дзяржаўныя ўтварэнні, так і грамадства ў цэлым, нясуць у сабе шырокі спектр гуманітарных пагроз. На жаль, сёння *не стае* не толькі погляду з асобным філасофскім, тэарэтычным і метадалагічным інструментарыем на сепаратызм, як на сістэмны феномен, які закранае фактычна ўсе сферы жыцця чалавека, але і адпаведаючага яму падыходу, што накіраваны на прадухіленне сепаратыўных выклікаў і працэсаў.

У адной з апошніх работ [1] намі быў прапанаваны абагульнены прынцып «назіральніка-ўдзельніка», які разглядае «наяўнасць разумнага суб'екта і яго акты пазнання як структураўтвараючы фактар антаэпістэмалагічнага марфагенеза складанасці, па меншай меры, у яе структурна-функцыянальным аспекце» [1, с. 33]. Праблема, якая вынікае з адзначанага прынцыпу, заключаецца ў наступным: як праяўляецца ў ім дынамічнасць соцыуму, марфагенез сацыяльнасці і сацыяльная самаарганізацыя ў цэлым? Да таго ж, калі мы разглядаем сацыяльную самааргнізацыю як вынік складанага ўзаемадзеяння розных узроўняў сацыяльнай рэчаіснасці (мікра-, меза-, макра-), то паўстае пытанне аб структурнасці ў першую чаргу мікраўзроўню. Як нам падаецца, адным з кампанентаў гэтай структурнасці, але не ключавым, з'яўляюцца кагнітыўна-эпістэмалагічныя структуры, уласцівыя суб'екту, і якія могуць уплываць на яго дзеянні і дзейнасць, і праз гэта – на дынаміку сацыяльнай самаарганізацыі ў цэлым. У дадзеным выпадку размова ідзе аб асобым працэсе прычынення і ўзаемаабумоўленасці, з аднаго боку, ментальных структур, абумоўленых магчымасцю функцыянавання свядомасці, і сацыяльнасці як часткі рэальнасці – з другога.

Такім чынам, мэта артыкула – у кантэксце абагульненага прынцыпу «назіральніка-ўдзельніка», з аднаго боку, і сепаратыўных працэсаў – з іншага, абазначыць кагнітыўна-эпістэмалагічныя структуры як складнік сацыяльнай самаарганізацыі на мікраўзроўні соцыума і вызначыць філасофскія і тэарэтыка-метадалагічныя падставы супрацьстаяння працэсам сепаратызму.

Адсюль мэтазгодна ў працэсе даследавання вырашыць дзве задачы, філасофскага і тэарэтыка-метадалагічнага кшталту адпаведна. Па-першае, разгледзець кагнітыўна-эпістэмалагічныя падставы сацыяльнай самаарганізацыі соцыуму. Па-другое, прапанаваць асновы тэарэтычнага і метадалагічнага інструментарыя супрацьдзеяння сепаратыўным працэсам.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Асноўная частка.** У сваіх даследаваннях Р. Дэкарт заклаў асновы для субстанцыйнага, або картэзіянскага, дуалізму. Згодна яму, свядомасць і цела з'яўляюцца рознымі сутнасцямі, або субстанцыямі – «думаючай» і «працяглай» адпаведна [2, с. 335–336]. Гэта паслужыла крыніцай развіцця яго ідэй, у першую чаргу ў рамках субстанцыяналізму. Аднак ключавое яго меркаванне – інтэракцыянізм – падвяргаецца крытыцы і цяпер з-за немагчымасці строга лагічна даказаць аўтаномны характар узаемадзеяння свядомасці і цела праз адсутнасць эмпірычных дадзеных пра гэта. «Наша душа, – адзначае Р. Дэкарт, – у сілу ўласцівай ёй здольнасці да пазнання выносіць меркаванне аб тым, што названыя адчуванні вынікаюць не толькі з яе адной, паколькі яна – рэч думаючая, але таксама і паколькі яна звязаная з нейкай іншай працяглай рэччу, якая рухаецца дзякуючы размяшчэнню сваіх органаў; апошняя і называецца ўласна чалавечым целам» [2, с. 349].

Сёння інтэракцыянізм сутыкаецца з праблемай сумяшчэння каўзальнай замкнёнасці фізічнага, з аднаго боку, і каўзальнай дзейснасці свядомасці. Паводле першага прынцыпу, які таксама часта называюць прынцыпам паўнаты фізічнага, любое фізічнае дзеянне мае дастатковую фізічную прычыну, адсюль для яго тлумачэння няма неабходнасці звяртацца да нефізічнай прычыны. Да прыкладу, для таго, каб растлумачыць з'яву «рух галавы», будзе дастатковым звярнуцца да няйронавых працэсаў, што адбываюцца ў чалавечым мозгу. З іншага боку, маецца іншы аспект «руху галавы», які можна назваць ментальным бокам дадзенай з'явы. У прыватнасці, калі мы тлумачым яго толькі фізічнымі прычынамі, то застаецца ў цені каўзальная сувязь свядомасці і фізічнага свету ў цэлым, і ўплыву свядомасці на нашы паводзіны – у прыватнасці. Тым больш, элімінуюцца да фізікалісцкага тлумачэння такія філасофскія праблемы, як свабода выбару і маральная адказнасць па той прычыне, што калі паводзіны чалавека не кантралююцца свядомасцю, то наша жыццё асабліва прадвызначана фізічнымі законамі, якія ў выніку і нясуць за нашы ўчынкі адказнасць.

Зараз у філасофіі свядомасці існуе пэўная колькасць падыходаў да вырашэння адзначанай вышэй праблемы. Цікавасць уяўляе распаўсюджаны ў сучаснай аналітычнай філасофіі свядомасці падыход, што развівае Д. Чалмерс, і які закранае свядомасць як асобны феноменам наогул, і называецца аўтарам натуралістычным дуалізмам. Як адзначае Д. Чалмерс, «застаецца, зрэшты, верагодным, што, хоць свядомасць не можа быць *выведзена* з нейкай фізічнай асновы, яна спараджаецца ёю. І пазіцыя, да якой мы прыйшлі, палягае ў тым, што свядомасць узнікае на фізічным субстраце, дзякуючы пэўным кантынгентным законам прыроды, якія самі па сабе не з'яўляюцца наступствам фізічных законаў... Сам факт, што ментальнае павінна *спараджацца* мозгам, паказвае на тое, што тут здараецца нешта, што выходзіць за межы фізічных фактаў (курсіў Д. Чалмерса. – *Я.Е.*)» [3, с. 162–163].

Такім чынам, падыход Д. Чалмерса імкнецца сумясціць «рэальнасць» свядомасці, з аднаго боку, і яе навуковае тлумачэнне як нерэдуцыруемага да фізічнай рэальнасці феномена. У дадзеным падыходзе ёсць як станоўчыя моманты, так і недахопы. У прыватнасці, да станоўчых момантаў варта аднесці імкненне Д. Чалмерса суаднесці свядомасць з фізічнай рэальнасцю, апелюючы да строга навуковага тлумачэння феномена свядомасці і выяўлення канкрэтных законаў, якія рэгулююць ментальнае. У прыватнасці, згодна з пазіцыяй Д. Чалмерса, існуе дуалізм нізкаўзроўневых фізічных уласцівасцяў і высокаўзроўневых псіхічных уласцівасцяў мозга. У дадзеным выпадку гаворка ідзе аб так званай лакальнай супервентнасці свядомасці на фізічным. Прызнанне дадзенага дуалізму прыводзіць да таго, што свядомасць, а дакладней протафенаменальныя ўласцівасці, адказваючы за рэалізацыю пэўных фізічных уласцівасцяў, складаюць нароўні з фізічнымі ўласцівасцямі фізічны свет.

У сваю чаргу В.В. Васільеў абапіраецца на так званую фенаменалістычную анталогію, базавыя палажэнні якой уключаюць тры наступныя пункты:

1) прынцып адпаведнасці мінулага і будучыні (чаканне, што за пэўнымі падзеямі-прычынамі ідуць пэўныя падзеі-наступствы);

2) прынцып каўзальнай веры (усе падзеі маюць прычыны);

3) прынцып экзістэнцыяльнай веры (знешні фізічны свет рэальны) [4, с. 27–48].

На гэтай падставе В.В. Васільеў крытыкуе лакальную супервентнасць як няправільны падыход да вывучэння свядомасці і прапануе лакальны інтэракцыянізм як прынцыпова іншы падыход. Як піша В.В. Васільеў, «калі я рэальна мог бы прыйсці да свайго цяперашняга фізічнага

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

стану іншым шляхам (першая пасылка) і калі, як вынікае з другой пасылкі, я валодаў бы тады іншымі ўспамінамі (падзеі, дзякуючы якім мой арганізм прыходзіць у той ці іншы стан, – гэта падзеі, якія адбываюцца з ім і ў яго асяроддзі і якія адлюстроўваюцца ў маіх успамінах), то, улічваючы, што мае ўспаміны фундуюць мае перакананні і жаданні і што мае перакананні і жаданні *скарэляваны* з маімі паводзінамі (трэцяя пасылка), у такой сітуацыі я, хутчэй за ўсё, паводзіў бы сябе інакш, чым паводжу сябе цяпер, нягледзячы на тое, што з фізічнага боку я быў бы ідэнтычнай копіяй свайго цяперашняга фізічнага Я (курсіў наш – *Я.Е.*)» [4, с. 114].

Такім чынам, лакальны інтэракцыянізм, з аднаго боку, не адмаўляе ў фізічных падзеях поўнага пераліку фізічных прычын, але з іншага – не рэдукуе ментальнае да фізічнага і дапускае наяўнасць лакальных нефізічных прычын, якія дублююць нелакальныя фізічныя прычыны. Адсюль, піша В.В. Васільеў, «ментальныя станы трэба трактаваць менавіта як неабходныя ўмовы рэалізацыі нелакальнай фізічнай прычыннасці» [4, с. 179].

Выходзячы з адзначанага, прапануем асаблівыя кагнітыўна-эпістэмалагічныя схемы ў частцы ментальнасці, якія карэлююць з сацыяльнай рэальнасцю на ўзроўнях узаемаўплываў адно на аднаго, як *сацыяльныя карціны свету* (далей – СКС). У гэтым кантэксце хацелася б зноў акцэнтаваць увагу на двух найважнейшых, на наш погляд, аспектах лакальнага інтэракцыянізму. Па-першае, як адзначае В.В. Васільеў, наяўнасць у чалавека «суб'ектыўных успамінаў як прыватных ментальных станаў апраўдвае тое, што адныя фізічныя шэрагі падзей, якія прыводзяць гэтых людзей да фізічнага стану *B*, могуць выклікаць у нас чаканне фізічнай падзеі *C*, тады як іншыя шэрагі фізічных падзей, якія вядуць да таго ж фізічнага стану *B*, могуць выклікаць у нас чаканне якой-небудзь іншай фізічнай падзеі» [4, с. 108].

Па-другое, «кажучы пра тое, што ментальнае аказваецца неабходнай анталагічнай умовай рэалізацыі нелакальнай фізічнай прычыннасці, трэба падкрэсліць, што гэта неабходная ўмова не з'яўляецца нейкім незалежным каўзальным фактарам. У адваротным выпадку фізічныя фактары не былі б дастатковымі ўмовамі, гэта значыць прычынамі тых ці іншых паводзін. Але, паколькі ментальнае ў глабальным плане супервентна на фізічным, яно сапраўды не можа разглядацца як незалежны каўзальны фактар, і яго наяўнасць не пазбаўляе фізічныя фактары якасці дастатковасці» [4, с. 179].

Прыведзеныя вышэй два аспекты лакальнага інтэракцыянізму карэлююць з абазначаным вышэй абагульненым прынцыпам «назіральніка-ўдзельніка». Так, яны абодва акцэнтуюць увагу на месца суб'екта і, у першую чаргу, яго свядомасці ва ўніверсуме ў якасці аднаго з сістэмаўтвараючых фактараў фізічнай рэальнасці, задаючага множнасць і мультыварыятыўнасць у анталагічных і эпістэмалагічных аспектах. Суб'ект з наяўнай рэальнасці праз свядомасць анталагізуе пэўную частку гэтай рэчаіснасці, спараджаючы тым самым суб'ектна-суб'ектыўнае (эпістэмалагічнае) разуменне фізічнай рэальнасці і працэсаў, якія адбываюцца ў ёй, якое (разуменне) у працэсах канстытуявання і канструявання імкнецца быць суаднесена з наяўнай анталогіяй у максімальным супадзенні [1, с. 39]. Іншымі словамі, роля свядомасці суб'екта не ў тым, каб з'яўляцца адлюстраваннем рэчаіснасці, а ў тым, каб адлюстроўваць рэчаіснасць у суб'ектыўным ключы.

Адсюль сацыяльныя карціны свету з'яўляюцца аб'ектывацыяй і яе вынікам у якасці лакалізацыі ў свядомасці суб'ектыўна ўспрыманых суб'ектам фактаў / падзей / з'яў у яго паводзінах і дзеяннях у вонкавым, у адносінах да свядомасці, свеце. У гэтым кантэксце сацыяльныя карціны свету трэба разглядаць як адкрытую сістэму, што ўзнікае ў працэсе ўзаемадзеяння і ўзаемапераходу суб'екта, яго дзейнасці і свядомасці, з аднаго боку, і асяроддзя – з іншага. Такім чынам, СКС дынамічны і складаным чынам дэтэрмінаваны. У той жа час СКС выступае ідэальнай сістэмай у тым сэнсе, што яна рэальная, але з'яўляецца канцэптам. У пэўным сэнсе гэта родніць СКС з кваліатыўнасцю свядомасці, аднак у той жа час маецца праблема існавання саміх *qualia*, як увасабленне суб'ектыўнай падставы свядомасці. Дадзеную праблему можна сфармуляваць у жорсткай і мяккай формах. Адпаведна жорсткая форма: «Ці не з'яўляецца *qualia* ўдалым канцэптам для рэдукавання свядомага досведу "Я" да суб'ектыўных адчуванняў?» Іншымі словамі, «ці існуюць *qualia* наогул?». Мяккая форма пытання не адмаўляе існаванне *qualia*, аднак ставіць праблему

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

структуры і канкрэтызацыі элементаў *qualia*: «Што ўваходзіць у тое, што мы называем *qualia*?». Абедзве формы пытання, так ці інакш, абумоўліваюцца супярэчлівасцю, і, магчыма, недастатковасцю нашых ведаў пра свядомасць і, таму, на першы погляд, у жорсткай форме адказ завязаны на яе прыродзе. Сапраўды, калі мы выходзім, да прыкладу, з розных форм субстанцыяналізму ці кагнітывізму, то мы мусім станоўча адказаць на пытанне аб існаванні *qualia* як нейкіх ментальных феноменаў, аднак праблема іх структуры і канкрэтызацыі з'яўляецца для нас нявырашанай па прычыне складанасці самой свядомасці. Адпаведна адказаць на дадзеныя пытанні адначасова, на першы погляд, не прадстаўляецца магчымым у кантэксце, да прыкладу, таго ж субстанцыяналізму.

У сваю чаргу І.Я. Прысь прапанаваў іншы падыход да праблемы *qualia* і свядомасці, у прыватнасці, у рамках вітгенштэйнаўскіх «моўных гульняў» і «форм жыцця». Згодна Л. Вітгенштэйну, моўныя гульні ёсць «адзінае цэлае: мовы і дзейнасці, з якімі ён пераплецены» [5, с. 83]. Формы жыцця ж прадстаюць у разуменні аўтара як нявызначаная сукупнасць моўных гульняў і адзначаюцца ім як «тое, што неабходна прымаць, як дадзенае нам» [5, с. 314]. Апроч моўных гульняў і форм жыцця важным значэннем надзяляецца так званае правіла, дзякуючы якому «функцыянуюць» і моўныя гульні і, зрэшты, формы жыцця. Для паўнавартаснага выкарыстання мовы правілы мусіць быць зразумелыя самі па сябе. «Прыгадаем жа, – піша Л. Вітгенштэйн, – у якіх выпадках сцвярджаюць, што гульня праводзіцца па нейкаму пэўнаму правілу! Правіла можа быць інструкцыяй пры навучанні гульні. Яго паведамляюць вучню і навучаюць яго прымяненню правіла. – Ці ж правіла выступае як інструмент самой гульні. – Ці ж яго не ўжываюць ні пры навучанні гульні, ні ў самой гульні; Не ўваходзіць яно і ў пералік правілаў гульні. Гульні навучаюцца, гледзячы на гульню іншых. Але мы кажам, што ў гульні выконваюцца тыя ці іншыя правілы, бо назіральнік можа "ўзяць" гэтыя правілы з практыкі самой гульні: як нейкі закон прыроды, якому падпарадкоўваюцца дзеянні граючых» [5, с. 105].

Вяртаючыся да праблемы свядомасці, пасылам да яе для І.Я. Прыся з'яўляецца тэзіс, што «нешта можа існаваць, быць дадзена толькі ў рамках моўнай гульні і, такім чынам, толькі ў рамках нейкай формы жыцця, а значыць – не аўтаномныя. Рэальнасць, як такая, адыграе ролю фону для іх» [6, с. 12]. Зыходзячы з гэтага, І.Я. Прысь вызначае свядомасць ці як «норму» / «дух», ці як «неканцэпталізаваны прыродны працэс», ці як моўную гульню, «якая змяшчае як ідэальныя элементы (дух), так і матэрыяльныя, прыродныя» [6, с. 12]. Апошняе «разуменне» свядомасці найбольш цікава тым, што яно (разуменне) залежыць «ад кантэксту прыродных (якія маюць рэальныя ўмовы свайго існавання) норм і іх ужыванняў» і ўпісана ў рамкі «той ці іншай нарматыўнай сістэмы» [6, с. 13]. Гэта значыць, заключае І.Я. Прысь, і «свядомасць як карэктная рэалізацыя адпаведнай нормы, гэта значыць у рамках "моўнай гульні", ёсць прыродная з'ява, рэальна, існуе» [6, с. 15].

Па аналогіі з апошнім «разуменнем» свядомасці, сацыяльныя карціны свету можна разглядаць як і вітгенштэйнаўскую «форму жыцця», якая існуе ў рамках пэўнай нормы (канцэпта, прадстаўлення, тэорыі, «гісторыі») і сумесна рэалізуецца праз некаторую сукупнасць моўных гульняў. Адпаведна СКС не з'яўляецца часткай сацыяльнай «рэальнасці», але яна неаддзельная ад яе з дапамогай існавання правіла і яго рэалізацыі праз і ў рамках моўных гульняў, якія з'яўляюцца пэўнымі і складанымі сацыяльнымі практыкамі. Але СКС не можа рэалізоўвацца па-за кантэкстам (можна сказаць, «асяроддзя»), які і выступае ў якасці нормы (правіла). Адпаведна СКС не статычны, а дынамічны, і змяненне якіх спараджаецца правілам (асяроддзем / кантэкстам), моўнымі гульнямі (практыкамі / дзеяннямі) і свядомасцю як канцэптуалізацыі фенаменальнага досведу. У дадзеным выпадку мы не адмаўляемся ад ідэі свядомасці, аднак з прычыны тэарэтычнай складанасці дадзенай праблемы не маем магчымасці раскрыць яе тут.

Растлумачым больш падрабязней сувязь сацыльных карцін свету з мовай і дзеяннем. Як палягаў Л. Вітгенштэйн, «словы мовы называюць прадметы – сказы гэта сувязь такіх найменняў... кожнае слова мае нейкае значэнне. Гэта значэнне суаднесена з дадзеным словам. Яно – адпаведны дадзенаму слову аб'ект» [5, с. 80]. У сваю чаргу, дзеянні («практыкі»), па сутнасці, з'яўляюцца часткай рэальнасці – уплецены ў рэальнасць – дзякуючы мове. Паводле ж пазіцыі прадстаўнікоў дзейнаснага падыходу, дзейнасць выступае неабходнай падставай напаўнення псіхікі чалавека

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сваім зместам для самарэгуляцыі сваіх паводзін. На наш погляд, недахоп дзейснага падыходу заключаецца ў тым, што дзейнасць, як такая, уяўлялася найважнейшай передумовай далучэння да фенаменальнай сутнасці рэчы і ўтварэння асноўных паняццяў для мыслення. Як жа ўяўляецца, няма сэнсу разрываць сувязь паміж мовай і дзеяннем: дзеянне як бы «адкрывае» фенаменальную сутнасць рэчаў, а мова – «замацоўвае» яе праз моўныя гульні і формы жыцця.

Такім чынам, сацыяльныя карціны свету, зыходзячы са сказанага, з'яўляецца прадуктам узаемадзеяння сацыяльнай рэальнасці, мовы, дзейнасці і свядомасці суб'екта. Менавіта дзякуючы гэтым чатыром фактарам СКС з'яўляецца сістэмай кагнітыўна-эпістэмалагічных схем, якія спрошчваюць успрыманне сацыяльных працэсаў, але ў той жа час даюць магчымасць спараджаць новыя сэнсы і, адпаведна, новае і іншае разуменне сацыяльнай рэальнасці. У той жа час мяркуем, што сацыяльныя канфлікты рознага кшталту можам разглядаць і як канфлікты розных суб'ектаў са сваімі сацыяльнымі карцінамі свету, што можна ахарактарызаваць як *эпістэмічны канфлікт*. Калі ў якасці структурных уласцівасцяў СКС разглядаць «сэнс» і «каштоўнасць» на той падставе, што абазначаныя кагнітыўна-эпістэмалагічныя схемы палягаюцца як наданне сэнсу не простым падзеям / з'явам / працэсам, але і тым, што разумеюцца суб'ектамі як каштоўнасныя, то можна прапанаваць тры наступныя тыпы канфліктаў сацыяльных карцін свету ад самага «бяспечнага» да найбольш эскалацыйнага: эпістэмна-лагічны, аксіялагічны і аксія-эпістэмна-лагічны.

Першы тып канфлікту выступае канфліктам «ведаў пра нешта...». Веданне аб якіх-небудзь сацыяльных падзеях або працэсах, як і любое веданне наогул, дыскрэтнае па сваёй прыродзе, таму назіраецца множная сэнсавая інтэрпрэтацыя адной падзеі / з'явы / працэсу. Канфлікт, такім чынам, адбываецца паміж рознымі «сэнсамі» як структурнымі ўласцівасцямі, як паміж рознымі СКС, так і ўнутры адной.

Другі тып з'яўляецца канфліктам «значнасці чаго-небудзь...». Гэта значыць выступае як канфлікт інтэрпрэтацый месца той ці іншай падзеі / з'явы / працэсу ў структуры гістарычнай прасторы-часу. З прычыны таго, што «каштоўнасць» як адна са структур СКС з'яўляецца надіндывідуальнай якасцю, то ўяўляецца, што разгляданы тып канфлікту больш глыбокі, чым эпістэмна-лагічны. Па-першае, ён можа паўстаць як унутры таго ці іншага грамадства, як вынік наяўнасці ў гэтым грамадстве двух і больш буйных калектыўных супольнасцей, якія разглядаюць тую іншую падзею / з'яву / працэс з пункта погляду значнасці для сябе як часткі пэўнай супольнасці. Па-другое, ён можа так жа паўстаць і паміж рознымі грамадствамі, якія маюць у сваім гістарычным развіцці агульныя моманты. У дадзеным канфлікце не прынцыповая несупярэчлівасць канфліктуючых карцін свету, але кожны ўдзельнік канфлікту імкнецца падмацоўваць сваю карціну свету менавіта каштоўнаснымі кампанентамі і канфігурацыямі.

Трэці тып канфлікту неаддыктыўна ўбірае ў сябе асаблівасці двух папярэдніх тыпаў і з'яўляецца, на наш погляд, самым глыбокім з разгледжаных. Перш за ўсё, гэты канфлікт з'яўляецца вынікам супярэчнасцей і сэнсу, і каштоўнасці той ці іншай падзеі / з'явы / працэсу. Акрамя таго, калі ў двух папярэдніх выхадам з канфлікту з'яўляецца пошук агульных сэнсавых або каштоўнасных канфігурацый у канфліктуючых СКС, то для таго, каб пераадолець разгледжаны тып канфлікту, неабходна адначасова знаходзіць пункты судакранання і ў сэнсавых, і ў каштоўнасных структурах, што ўяўляецца вельмі складаным. У гэтых адносінах гэты тып канфлікту, як нам уяўляецца, найбольш верагодна можа перарасці ў «гарачы» канфлікт пры адпаведных абставінах.

Такім чынам, адзначым, што развіццё сепаратыўных працэсаў, якія мы разглядаем як комплекс сістэмна-сінергетычных эфектаў *спрошчвання-ўскладнення* у межах пэўнай сацыяльна-палітычнай сістэмы, які прыводзіць да крызісу адносін паміж цэнтральнай уладай і насельніцтвам пэўных тэрыторый, што абумоўлівае зніжэнне ўзроўню тэрытарыяльнай легітымнасці ўлады на гэтых тэрыторыях і агульнае аслабленне тэрытарыяльнай цэласнасці, яе распад і дэзінтэграцыю, можа быць прадстаўлены як эскалацыя дзеянняў сацыяльных актараў і палягаць ва эвалюцыі канфлікту прыхільнікаў і праціўнікаў сепаратызму, для якіх уласціва прытрымлівацца той ці іншай сацыяльнай карціны свету. Прадукаванне гэтых канфліктуючых СКС ёсць працэс аб'ектывацыі сацыяльнай рэальнасці, уключаючы ўласцівыя і адмысловыя для сепаратызму фактары, асноўны змест якой (аб'ектывацыі) з'яўляецца развіц-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

цё дыхатаміі «частка-цэлае» на ўзроўні тэрытарыяльнай цэласнасці пэўнай сацыяльна-палітычнай сістэмы. Сітуацыю эскалацыі розных карцін свету, з пункта погляду сацыяльнай самаарганізацыі, трэба разглядаць як перавагу спрошчвання над ускладненнем.

Са сказанага вынікаюць падставовыя элементы стратэгіі супрацьдзеяння сепаратыўным працэсам. Наяўнасць супрацьлеглых і канфліктуючых паміж сабою сацыяльных карцін свету не з'яўляецца праблемай, тое ж самае тычыцца і этнічнай, канфесійнай і моўнай разнастайнасці. Наадварот, імкненні да ліквідацыі аднастайнасці больш эскалююць агульную сітуацыю і могуць мець вялікія наступствы ў будучыні. Адсюль асноўная стратэгія, якая мусіць палягацца ў супрацьстаянні сепаратызму, павінна быць накіравана на *неэсклацыю*, на неўскладненне і непаскарэнне дынамікі. Сам змест стратэгій – канкрэтныя крокі – павінен быць індывідуальны і залежыць ад асаблівасцей сітуацыі ў той ці іншай дзяржаве, у якой існуе пагроза развіцця сепаратызму. Аднак інварыянтнасць гэтых стратэгій мусіць палагацца ў стварэнні ўмоў не для эскалацыі і паскарэння дынамікі працэсу, а для дыялогу не паміж канфліктуючымі бакамі, а *карцінамі свету* для агульнага суаднясення іх элементаў. Апошняе неабходна для таго, каб задаць шляхі для кагерэнтага ўзаемадзеяння рознанакіраваных сацыяльных карцін свету ды гарманізацыі і самаарганізацыі наогул. Мяркуем, што на розных этапах працэсу доля гэтай стратэгіі будзе мець розны поспех, бо ў перыяд найбуйнейшай эскалацыі – грамадзянскай вайны – такое ўзаемадзенне розных карцін свету можа не мець, да і не будзе мець дастатковага плёну.

Як паказвае закон максімума эфектыўнасці – адзін з законаў узаемнай адаптацыі і трансфармацыі структур сістэм В.Ф. Венды – «эфектыўнасць сістэмы пры пэўнай яе структуры максімальная, калі значэнне кантралюючага фактара ўзаемнай адаптацыі аптымальная» [7, с. 99]. Іншымі словамі, у сітуацыі, калі ў структуры пэўнай СКС дамінуюць элементы эскалацыі, якая выступае як дамінуючая стратэгія для пэўных сацыяльных суб'ектаў, узаемная адаптацыя канфліктуючых бакоў не можа быць знойдзена па той прычыне, што іншая, канфліктуючая з першай, СКС таксама мусіць быць накіравана на эскалацыю. У гэтым кантэксце да эксалацыі неабходна аднесці і імкненні таго ці іншага боку да ўзаемнага знішчэння.

Апроч таго, згодна з законам трансфармацыі В.Ф. Венды – «структуры сістэмы трасфармуюцца адна ў другую праз агульны для іх стан сістэмы» [7, с. 100] – агульных для двух сістэм структур ці элементаў структур можна дасягнуць толькі праз агульны стан гэтых сістэм. Адсюль для паспяховага супрацьстаяння сепаратыўным выклікам і працэсам неабходна, каб узаемадзеянне канфліктуючых СКС было заснавана на *рэфлексіўнай* накіраванасці асэнсавання агульных элементаў карцін свету супрацьлеглых бакоў як калектыўных суб'ектаў гісторыі, што ўсведамляюць усю пэўную сацыяльна-палітычную цэласнасць неаддзялімай. У агульным сэнсе, праз рэфлексіўнае ўзаемадзеянне канфліктуючых карцін свету не толькі неабходна знайсці агульны праект на падставе адзінства пэўнай сацыяльна-палітычнай цэласнасці, але і адвергнуць інтэнцыі на эскалацыйнае ўзаемадзеянне. Адной з форм прымянення рэфлексіі як спосабу нахаджэння і асэнсавання агульных элементаў сацыяльна-палітычнай цэласнасці можа выступаць распрацаваная і прапанаваная раней асіметрычная мадэль карэляцыі адказу сістэмнай цэласнасці соцыума на выклік сепаратызму [8], дзе рэфлексія вылучаецца ў якасці інструмента для арганізацыі сістэмнага адказу праз агульную гісторыі цэласнасці, суб'ектаў гісторыі і іншых сацыяльных актараў *усёй* сацыяльна-палітычнай сістэмы, абмяжоўваючы такім чынам развіццё працэсу да грамадзянскай вайны. Аднак адна справа, калі аддзяленне пэўнай тэрыторыі адбываецца праз ваенную агрэсію, а іншая – калі ў дзяржаве сапраўды ініцыююцца сепаратыўныя працэсы, аднак паскарэнне іх агульнай дынамікі мае вонкавыя крыніцы. У гэтай сітуацыі канфлікт адбываецца не столькі паміж карцінамі свету ўнутры пэўнай дзяржавы, колькі паміж дзяржавамі. Таму стратэгія пераадольвання сепаратызму павінна ісці праз трэці бок, які можа выступаць медыятарам і месцам «сустрэчы» па-сапраўднаму канфліктуючых у гэтай сітуацыі бакоў – адной дзяржавы з іншай.

**Заключэнне.** У кантэксце адзначанага, такім чынам, сфармулюем філасофска-тэарэтычныя і тэарэтыка-метадалагічныя падставы супрацьдзеяння сепаратыўным працэсам.

Па-першае, адзначаныя сацыяльныя карціны свету прадстаюць у якасці кагнітыўна-эпістэмалагічных схем сацыяльнай рэальнасці, якімі ў сваёй дзейнасці аперуюць розныя сацыяльныя суб'екты, ці назіральнікі-ўдзельнікі. Дзякуючы гэтаму назіраецца не толькі плюра-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

лістычнасць інтэрпрэтацый сацыяльнай рэальнасці, але і ўскладненне дынамікі асобных працэсаў, такіх як сепаратыўныя, дзе на мікраўзроўні адзначаецца супрацьстаянне розных сацыяльных карцін свету, якія, аднак, у той жа час могуць мець адзіную анталагічную (*«гістарычную»*) прыроду. Адзначанае, па-сутнасці, можа выступаць у якасці першапрычыны, ці неабходнай умовай, зараджэння працэсаў сепаратызму.

Па-другое, важнейшай тэарэтыка-метадалагічнай перадумовай процідзеяння сепаратыўным выклікам і працэсам з'яўляецца прызнанне *«легальнасці»* і права на існаванне Іншага і іншай сацыяльнай карціны свету адпаведна. Адсюль інварыянтны элемент магчымых стратэгій супрацьстаяння сепаратызму мусіць заключацца ва ўзаемнай адаптацыі не дзеянняў, а *сацыяльных карцін свету* са знаходжаннем агульных карэлятыўных элементаў і з наступным выхадам на агульнапрыняты алгарытм дээскалацыі адносін.

**Літаратура**

1. Ермаков, Е. С. Онтологические и эпистемологические проблемы сложности / Е. С. Ермаков // Философия науки. – 2021. – № 4. – С. 25–42.

2. Декарт, Р. Сочинения : в 2 т. / Р. Декерт ; сост., ред., вступ. ст. В. В. Соколова ; пер. с лат. и франц. – М. : Мысль, 1989. – Т. 1. – 654 с.

3. Чалмерс, Д. Сознающий ум : В поисках фундаментальной теории / Д. Чалмерс ; пер. с англ. В. В. Васильева. – Изд. 3. – М. : URSS, 2019. – 512 с.

4. Васильев, В. В. Сознание и вещи : Очерк феноменалистической онтологии / В. В. Васильев. – М. : Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2014. – 240 с.

5. Витгенштейн, Л. Философские работы / Л. Витгенштейн ; сост., вст. ст., примеч. М. С. Козловой ; пер. с нем. М. С. Косовой, Ю. А. Асеева. – М. : Изд-во «Гнозис», 1994. – Ч. I. – 612 с.

6. Присъ, И. Е. Природа и сознание / И.Е. Присъ // Научно-практический журнал Диалог. – 2018. – № 3. – С. 8–17.

7. Венда, В. Ф. О законах взаимной адаптации и трансформации систем / В. Ф. Веда // Вопросы философии. – 2017. – № 2. – С. 94–105.

8. Ермаков, Е. С. Философско-методологический инструментарий анализа и моделирования сепаративных процессов / Е. С. Ермаков // Философские исследования. – 2019. – Вып. 6. – С. 45–57.

Институт философии
НАН Беларуси

Поступила в редакцию 04.05.2022

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ